## **2025 г. - 125 гадоў з часу першага згадвання пра школу ў вёсцы Гарадзец Кобрынскага раёна (дзяржаўная ўстанова адукацыі «Гарадзецкая сярэдняя школа»; 1900)**



Гісторыя школы ў в. Гарадзец Кобрынскага раёна бярэ свой пачатак з 1900 года, калі была пабудавана пачатковая школа. У канцы 1914 года школа з пачатковай аднакласнай ператварылася ў двухкласную пачатковую. У часы Першай сусветнай вайны многія жыхары выязджалі з Гарадца, таму школа прыпыніла сваю работу.

Навучальная ўстанова мяняла назвы і мовы выкладання, перажывала войны. Пры панскай Польшчы, пачынаючы з 1920 года, школа стала сямікласнай. У 1938 годзе быў пабудаваны новы будынак школы. Пасля вызваленчага паходу Чырвонай арміі ў Заходнюю Беларусь наладжвалася жыццё на савецкі лад. Ужо 1 кастрычніка 1939 года пачаліся заняткі па савецкай праграме. У гэты час дырэктарам школы быў Якаў Фёдаравіч Чэрнік.

У час нямецка-фашысцкай акупацыі (1941–1944) у будынку Гарадзецкай школы размяшчалася нямецкая камендатура. Многія настаўнікі і работнікі школы пайшлі на фронт. Пасля вызвалення Гарадца ў ліпені 1944 года заняткі ў школе аднавіліся 1 верасня 1944 года. У 1947 годзе адбыўся першы выпуск за курс сямігадовай школы. У тым жа годзе Гарадзецкай школе прысвоены статус сярэдняй (10 класаў). Першы выпуск за курс сярэдняй школы адбыўся ў 1950 годзе. З 1974 года ўстанова размяшчаецца ў былым будынку школы-інтэрната (вул. Савецкая, 12).

Прыярытэтным напрамкам работы школы з'яўляецца грамадзянска-патрыятычнае выхаванне і краязнаўчая работа. У 2004 годзе створаны краязнаўчы школьны музей. Юныя краязнаўцы і педагогі збіралі экспанаты па навакольных вёсках, хутарах. Кіраўніцтва ААТ «Гарадзец-агра» дапамагло сродкамі на афармленне экспазіцый. Спачатку экспанаты размяшчаліся ў адным пакоі, потым з’явіліся пакой баявой славы (2005), этнаграфічны пакой (2007). Экспазіцыі музея прысвечаны гісторыі, культуры і традыцыям вёсак Гарадзецкага сельсавета, выдатным землякам. Асобна

дэманструюцца дэкаратыўныя вырабы вучняў. Адметнай асаблівасцю дзейнасці ўстановы з'яўляецца рэгулярнае правядзенне выставак вырабаў народнага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва навучэнцаў і жыхароў аг. Гарадзец «Свет маіх захапленняў».

Юныя краязнаўцы і педагогі збіралі экспанаты па навакольных вёсках, хутарах. Кіраўніцтва ААТ «Гарадзец-агра» дапамагло сродкамі на афармленне экспазіцый. У музеі знаходзяцца рэдкія артэфакты: старажытныя прылады працы (крамянёвыя нажы, каменныя сякеры і інш.), човен XVIII стагоддзя, дакументы аб будаўніцтве Каралеўскага канала, кнігі польскай пісьменніцы Марыі Радзевіч, багатая нумізматычная калекцыя, шмат іншых прадметаў, якія адлюстроўваюць гісторыю мінуўшчыны і сучаснасць Гарадца. Сабраны ўнікальны матэрыял пра барацьбу землякоў з нямецка-фашысцкімі захопнікамі на франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскіх атрадах. Акрамя ваенных лістоў, рэшткаў зброі тут захоўваецца і багатая картатэка жыхароў Гарадзецкага сельсавета, якія загінулі ў час Вялікай Айчыннай вайны. Картатэка – вынік карпатлівай пошукавай работы настаўнікаў і вучняў школы. У 2016 годзе музей «Гісторыя вёскі Гарадзец» атрымаў званне «народны» і з’яўляецца сапраўдным цэнтрам краязнаўства і патрыятызму.

У 2008 годзе школа рэарганізавана ў дзяржаўную ўстанову адукацыі «Гарадзецкі дзіцячы сад-сярэдняя школа». Педкалектыў узначаліў Аляксандр Міхайлавіч Валасевіч, які і сёння з’яўляецца дырэктарам школы.

У сувязі з аптымізацыяй сеткі ўстаноў адукацыі Кобрынскага раёна ў школе з 2013 года працягваюць навучанне вучні Аніскавіцкай сярэдняй школы, з 2014 года - навучэнцы Грушаўскага дзіцячага сада-базавай школы. З 2022 года ўстанова перайменавана ў ДУА «Гарадзецкая сярэдняя школа», дзе сёння працуе 31 настаўнік, займаюцца 173 вучня.

Вучні школы пастаянна ўдзельнічаюць у краязнаўчых мерапрыемствах рэспубліканскіх акцый і дабіваюцца высокіх вынікаў, пра што сведчаць шматлікія ўзнагароды. Так, Маргарыта Данілевіч у конкурсе творчых работ «Дакументальны сведка вайны» ў намінацыі «Сямейная рэліквія» стала пераможцам раённага, абласнога і рэспубліканскага этапаў і ўзнагароджана дыпломамі I ступені (2013). Вучаніца школы Лізавета Тунчык неаднаразова перамагала ў разнастайных конкурсах. Навуковыя

даследаванні вучняў пастаянна трапляюць у лік лепшых на рэспубліканскіх конкурсах.

Установа ганарыцца сваімі выпускнікамі, якія сталі годнымі грамадзянамі і дасягнулі пэўных жыццёвых вышынь. Сярод іх: вучоны ў галіне аховы раслін, член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар біялагічных навук, прафесар Уладзімір Рыгоравіч Іванюк; кандыдат фізіка-матэматычных навук, прафесар Андрэй Андрэевіч Карпук; беларускі вучоны, спецыяліст у вобласці тэхнічнай кібернетыкі і інфарматыкі, доктар тэхнічных навук, прафесар Ігар Васільевіч Соўпель; заслужаны работнік культуры Беларускай ССР, дырыжор, кампазітар, арганізатар і кіраўнік харавых калектываў Ігар Паўлавіч Чэрнік і інш.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2025 г. Кобрынскай раённай
цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна,
бібліёграф І кат. аддзела абслугоўвання і інфармацыі.

**Музей** "Гісторыя вёскі Гарадзец" // Народныя музеі ўстаноў адукацыі Рэспублікі Беларусь. - Мінск, 2019. - С. 18—19.

Краязнаўчы музей "Гісторыя вёскі Гарадзец" заснаваны пры ДУА "Гарадзецкі дзіцячы сад — сярэдняя школа".

**Гарадзец – маленькі горад** : інфармацыйна-бібліяграфічны паказальнік да 880-годдзя з часу першага згадвання ў гістарычных крыніцах в. Гарадзец Кобрынскага раёна / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2022. – 72 с. : іл. – (Серыя «Па вёсках нашага краю»).

**Дзяржаўнай** установе адукацыі «Гарадзецкая сярэдняя школа» (1900) – 125 гадоў // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2020. - С. 195.

**Андросова, О.** Служить в армии — почетно / Ольга Андросова // Кобрынскі веснік. - 2025. — 22 лютага (№ 8). — С. 8.

В Городецкой средней школе Кобринского района с учащимися старших классов провели ученический лекторий "Вооруженные силы моей страны".

**Белов, Д**. Задача — уберечь детей от беды / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2025. — 7 сакавіка (№ 10). — С. 8.

Интерактивные занятия с учащимися Городецкой средней школы провела врач по медицинской профилактике центра "Ориентир" Ольга Филипеня.

**Белов, Д.** Подростковый суицид: предотврати беду / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2025. — 3 мая (№ 18). — С. 8.

В Городецкой средней школе Кобринского района прошло собрание трудового коллектива с рассмотрением вопросов профилактики суицидального поведения несовершеннолетних.

**Белов, Д.** Сделали чище свой агрогородок / Дмитрий Белов ; фото из архива Городецкой средней школы // Кобрынскі веснік. - 2025. — 19 красавіка (№ 16). — С. 8 : фот.

Учащиеся 8—9-х классов Городецкой средней школы Кобринского района приняли участие в экологической акции "Чистый берег.

**Белов, Д.** Учатся на экскурсиях / Дмитрий Белов ; фото из архива Кобринско-Малоритской МРОС ДОСААФ // Кобрынскі веснік. - 2025. — 4 студзеня (№ 1). — С. 8 : фот.

Учащиеся Городецкой средней школы Кобринского района посетили экспозицию музейной комнаты, посвященной истории боевых действий в Республике Афганистан.

**Белов, Д**. Цветы для любимого директора / Дмитрий Белов ; фото из архива Городецкого сельисполкома // Кобрынскі веснік. - 2025. — 7 сакавіка (№ 10). — С. 8 : фот.

**Белов, Д.** Помогли пожилым / Дмитрий Белов ; фото из архива Городецкой средней школы // Кобрынскі веснік. - 2024. — 26 кастрычніка (№ 43). — С. 8 : фот.

В рамках республиканской акции "Уважение. Забота. Ответственность" учащиеся Городецкой средней школы Кобринского района оказали посильную помощь одиноко проживающим пожилым людям.

**Белов, Д.** Студотряды закрыли семестр в Минске / Дмитрий Белов ; фото из архива Ольги Свиржевской // Кобрынскі веснік. - 2024. — 21 снежня (№ 51). — С. 8 : фот.

Учитель физики и информатики Городецкой средней школы Ольга Свиржевская представила Кобринщину на масштабном мероприятии студотрядовского движения во Дворце спорта в Минске.

**Белов, Д.** Узнали новое об институте президентства / Дмитрий Белов ; фото из архива Кобринской центральной районной библиотеки // Кобрынскі веснік. - 2024. — 7 снежня (№ 49). — С. 8 : фот.

Учащиеся Городецкой средней школы Кобринского района и СШ № 6 г. Кобрина посетили информационно-образовательные часы в Кобринской центральной районной библиотеке.

**Белов, Д.** Узнали о подвиге генерала / Дмитрий Белов ; фото из архива Городецкой средней школы // Кобрынскі веснік. - 2024. — 26 кастрычніка (№ 43). — С. 8 : фот.

Учащиеся Городецкой средней школы Кобринского района посетили музейное занятие "Виктор Пуганов. О мужестве, о доблести, о славе" в Кобринском районном центре детского творчества.

**Белов, Д**. Учить детей мечтала с детства / текст и фото Дмитрия Белова // Кобрынскі веснік. - 2024. — 30 лістапада (№ 48). — С. 8 : фот.

Про учителя физики и информатики Городецкой средней школы Кобринского района Ольгу Свиржевскую.

**Дубина, Л.** И снова школа позвала ребят / Людмила Дубина // Кобрынскі веснік. - 2024. — 14 верасня (№ 37). — С. 8.

О Городецкой средней школе Кобринского района.

**Дубина, Л**. Не забытое, но забытое / Людмила Дубина // Кобрынскі веснік . - 2024. — 21 верасня (№ 38). — С. 8 : фот.

В Городецкой средней школе Кобринского района действует народный музей "История деревни Городец".

**Дубина, Л.** Ориентируется отлично / Людмила Дубина // Кобрынскі веснік. - 2024. — 2 лістапада (№ 44). — С. 8 : фот.

В областных массовых соревнованиях по спортивному ориентированию "ORIENT — LIGA 2024" в 7 туре учащаяся 7 класса Городецкой средней школы Кобринского района Валентина Червяковская в заняла 1-е место.

**Дубина, Л.** Открываем Беларусь / Людмила Дубина // Кобрынскі веснік. - 2024. — 2 лістапада (№ 44). — С. 8.

По итогам районного этапа республиканского конкурса "Открываем Беларусь" учащиеся Городецкой средней школы Кобринского района награждены дипломами II степени.

**Дубина, Л.** Учат в школе / Людмила Дубина // Кобрынскі веснік. - 2024. — 12 кастрычніка (№ 41). — С. 8 : фот.

О педагогах Городецкой средней школы Кобринского района.

**Дубина, Л.** Цифровая звезда / Людмила Дубина // Кобрынскі веснік. - 2024. — 14 верасня (№ 37). — С. 8.

Городецкая средняя школа присоединилась к международному историческому проекту "Цифровая звезда".

**День** открытых дверей — для будущих водителей / по информации Кобринско-Малоритской МРОС ДОСААФ // Кобрынскі веснік. - 2021. — 2 студзеня (№ 1). — С. 10.

В ГУО «Городецкий детский сад-средняя школа» организовано обучение учащихся по программе подготовки водителей колесных тракторов категории А.

**Елизарова, Ж.** Летописец городецкого края / Жанна Елизарова ; фото из архива Натальи Чижевской // Кобрынскі веснік. - 2020. — 12 жніўня (№ 62). — С. 6 : фот.

О ветеране педагогического труда ГУО «Городецкий детский сад-средняя школа» Г. П. Чижевской.

**Дубіна, Л.** Дзяўчынка-самародак / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2017. — 23 верасня. — С. 3.

Вучаніца Гарадзецкага сада-сярэдняй школы Л. Тунчык неаднаразова перемагала ў разнастайных конкурсах.

**Дубіна, Л**. Сустрэча з «юнацтвам» / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2016. — 14 верасня. — С. 4.

У Гарадзецкім дзіцячым садзе-сярэдняй школе прайшла творчая сустрэча з удзельнікам народнага аматарскага аб`яднання «Белы бусел» Л. Ярмалюк.

**Дубіна, Л.** Мы – за мір! / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2015. — 30 верасня — С. 4.

Вучні ДУА «Гарадзецкі дзіцячы сад- сярэдняя школа» далучыліся да сусветнай акцыі «Дзень міру».

**Лесік, І.** Лёс, вызначаны дзяцінствам / Ірына Лесік // Кобрынскі веснік. – 2014. – 7 сакавіка. – С. 3.

Г. П. Чыжэўская 20 гадоў выкладае гісторыю ў Гарадзецкім садзе-сярэдняй школе.

**Грэчка, І**. Сотні падзяк за тое, што не ведаем вайны / Ігар Грэчка // Настаўніцкая газета. – 2013. – 3 снежня. – С. 5.

Пераможцай у акцыі, арганізаванай да 70-годдзя вызвалення Беларусі, у намінацыі «Сямейная рэліквія» стала вучаніца 9 класа Гарадзецкай СШ Маргарыта Данілевіч.

**Черник, В.** Хвала рукам, что пахнут хлебом / Вероника Черник // Кобрынскі веснік. – 2010. – 3 сакавіка. – С. 2.

Встреча учащихся Городецкой СШ с руководителями и передовиками производства ОАО «Городец-агро».

**Хільчук, М.** Трайны юбілей / Марыя Хільчук // Кобрынскі веснік. – 2000. – 26 жніўня. – С. 2.

Адразу тры юбілеі адзначылі ў Гарадзецкай сярэдняй школе.

**Хільчук, М.** З любоўю да людзей / Марыя Хільчук // Кобрынскі веснік. – 1998. – 10 чэрвеня. – С. 3.

Аб настаўніцах в. Гарадзец В. Грышчук, Г. Сташэўскай.

***Рэгіён:***

Кобрынскі раён

Гарадзец

***Установы:***

Гарадзецкая сярэдняя школа

***Прадметы:***

Школы